**В. С. Новак, А. А. Кастрыца**
Філалагічны факультэт,
кафедра беларускай культуры і фалькларыстыкі

# АРГАНІЗАЦЫЯ ФАЛЬКЛОРНЫХ СВЯТ ЯК ВАЖНЫ КАМПАНЕНТ ВУЧЭБНА-ВЫХАВАЎЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Вывучэнне духоўнай культуры нашага народа і клопаты аб яе захаванні і развіцці – прыярытэтны накірунак дзяржаўнай палітыкі ў галіне ідэалагічнай і выхаваўчай работы. Адной з найважнейшых мэт патрыятычнага выхавання студэнцкай моладзі з'яўляецца захаванне асноў этнічнай самабытнасці. У гэтых адносінах аўтэнтычны фальклор беларусаў – сапраўдная скарбніца народных ведаў, крыніца выхавання любові да роднай зямлі, роднага народа, яго звычаяў і абрадаў, легендаў і паданняў, міфалагічных апавяданняў і казак – усяго таго, што з'яўляецца духоўнай асновай нацыі.

На працягу шматлікіх гадоў на філалагічным факультэце Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта праводзіцца планамерная навукова-метадычная работа па далучэнні студэнтаў да скарбаў народнай мудрасці. Варта адзначыць, што работа мае сістэмны і комплексны характар: чытаюцца лекцыі і праводзяцца практычныя заняткі па дысцыплінах "Фалькларыстыка", "Славянская міфалогія", арганізоўваюцца палявыя фальклорна-этнаграфічныя экспедыцыі, наладжваюцца творчыя студэнцкія прэзентацыі, прысвечаныя духоўнай культуры Гомельшчыны і іншых рэгіёнаў Беларусі, вучэбна-практычныя канферэнцыі і сцэнізацыі фальклорных свят і абрадаў.

Што датычыць урачыстых фальклорных вечарын, то яны наладжваюцца як у студэнцкіх аўдыторыях, так і ў розных сацыякультурных цэнтрах горада (бібліятэках, школах, выставачных залах), і заўсёды выклікаюць шчырую зацікаўленасць іх наведвальнікаў, якія не толькі ўважліва глядзяць прапануемыя тэатралізаваныя дзеі, але і задаюць пытанні, прымаюць актыўны ўдзел у конкурснай частцы мерапрыемстваў, якія заўсёды носяць інтэрактыўны характар і даюць магчымасць імправізацыі.

Як правіла, на філалагічным факультэце УА "ГДУ імя Ф. Скарыны" навучаюцца студэнты з розных раёнаў Гомельшчыны ў прыватнасці



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і Беларусі ўвогуле, менавіта таму важнае значэнне набывае правядзенне свят на глебе мясцовага фальклору. Звычайна студэнты, калі ім прапануецца такі творчы від арганізацыі калектыўнай дзейнасці, выкарыстоўваюць пры напісанні сцэнарыяў фальклорных свят і абрадаў аўтэнтычныя матэрыялы палявых экспедыцыйных даследаванняў і індывідуальныя запісы фальклорна-этнаграфічных звестак, зробленыя ў сваіх мясцовасцях. Яны ўлічваюць пэўныя патрабаванні, якія датычаць сцэнізацыі той ці іншай абрадавай з’явы, пазбягаюць штучнасці і эклектычнага спалучэння традыцый розных рэгіёнаў пры напісанні сцэнарыя, імкнуцца глыбока вывучыць фальклорна-этнаграфічныя традыцыі той ці іншай мясцовасці і правільна прадставіць, напрыклад, структуру вяселля або калядна-навагодняга комплексу таго ці іншага рэгіёна, улічыўшы пры гэтым багацце рэгіянальна-лакальных праяў абрадавых з’яў.

Звесткі рэгіянальна-лакальнага характару, запісаныя ў палявых экспедыцыях на тэрыторыі Гомельшчыны, прапануюцца студэнтам толькі пасля таго, як яны пазнаёмяцца падчас лекцый з асаблівасцямі агульнабеларускай народнай духоўнай спадчыны. Гэта прынцыпова, паколькі яны павінны зразумець, што фальклор як від мастацтва, які мае агульнанародны характар і адлюстроўвае агульныя для ўсяго народа погляды, ідэалы, імкненні, спадзяванні, надзвычай багаты на рэгіянальна-лакальныя асаблівасці, паколькі бытуе на мясцовым узроўні. І толькі на гэтым этапе студэнты атрымліваюць магчымасць калектыўна скласці сцэнарый.

Прывядзем у якасці прыкладаў асобныя матэрыялы па каляднай абраднасці, сабраныя ў палявых экспедыцыях на тэрыторыі Лоеўскага, Добрушскага і Калінкавіцкага раёнаў Гомельскай вобласці, якія былі выкарыстаны студэнтамі падчас падрыхтоўкі сцэнізацыі свята “Каляды на Гомельшчыне” і выклікалі найбольшую цікавасць гледачоў.

Так, арганічную частку калядна-навагодняй абраднасці ў розных вёсках Добрушскага раёна складаюць рытуальныя дыялогі, сярод якіх найбольш распаўсюджана было заклікание марозу, і суправаджалася яно славеснымі формуламі. Напрыклад, у в. Ігаўка звычай заклікаць мароз адбываўся на першую куццю і меў своеасаблівую мясцовую форму: маці прымушала хлопцаў залезці пад стол і адтуль крычаць: “Мароз, мароз, прыходзь куццю есць і не марозь нічога ў нас...” (запісана ад Драганавай Еўдакіі Фёдараўны, 1919 г.н.). Калядоўшчыкі ў гэтай вёсцы пачыналі абходныя шэсці “на Новы год, пад 13 студзеня, дзелалі фанары з буракоў, унутры ўсё выразалі і ставілі туды свечку. Гэты бурак свяціўся. А дзелалі гэта для таго, каб бачылі, што ідуць калядоўшчыкі” (запісана ад Драганавай Еўдакіі Фёдараўны, 1919 г.н.).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Факт полаўзроставай дыферэнцыяцыі калядоўшчыкаў пацвярджаецца звесткамі, запісанымі ў в. Стараселле Добрушскага раёна, дзе абрад ваджэння казы выконвалі маладыя людзі (хлопцы і дзяўчаты), а са “звяздой” хадзілі толькі хлопцы: “7 студзеня – Ражаство. К гэтаму святу забівалі свіней, начынялі каўбасы, пяклі бліны. З гэтага дня пачыналі калядаваць. Вадзілі “казу” хлопцы і дзеўкі разам, а “звязду” насілі толькі хлопцы. Калядоўшчыкі пераапраналіся ў цыганоў, козамі, намазвалі сажай вусы, шчадравалі, пелі песні. У канцы жадалі гаспадару ўсяго найлепшага, а ён частаваў іх салам, каўбасой, блінамі, пірагамі або даваў грошы”.

У абрадзе калядавання ў в. Вадовічы Калінкавіцкага раёна ўдзельнічалі, акрамя дзеда-павадыра з казой, і іншыя маскі. Напрыклад, “хто з маскай каня ходзіць, у форму салдата апранецца, у дзеда і бабу”. Калі маска “каня” – адметнасць мясцовай каляднай традыцыі в. Вадовічы, то зроблены з саломы павук, упрыгожаны сухімі кветкамі і пакладзены пад ікону на кут, – гэта лакальная дэталь у цырымоніі святкавання другой куцці ў в. Сырод Калінкавіцкага раёна. Наданнем павуку магічных уласцівасцей ахоўніка ў мясцовай народнай міфалагічнай традыцыі можна растлумачыць, чаму з такой пашанай адносіліся мясцовыя жыхары да звычаю ўшаноўваць саламяных павукоў напярэдадні Калядаў і “вешаць іх на шчасце ў покуце над сталом”. Захоўваўся і звычай ваджэння казы ў вёсках Калінкавіцкага раёна, а таксама мела месца пераапрананне ў цыган. Адметным у мясцовай каляднай традыцыі быў факт прысутнасці падчас калядавання абрадавага дрэўца – ёлкі (“мы делалі ёлку, цветы с бумаги делали на ёлку, это так её украшали” (запісана ў в. Дудзічы ад Савянок Вольгі Уладзіміраўны, 1929 г.н.). Звычайна насілі ёлку дзяўчаты (“А дзеўкі хадзілі з ёлкаю, 13 января хадзілі. Ёлка ўкрашалась цвятамі з бумагі” (запісана ў в. Вялікія Аўцюкі ад Маскаленка Вольгі Данілаўны, 1923 г.н.). Паколькі ўдзельнікі абраду калядавання сімвалізавалі духаў памерлых, то і выкарыстанне ёлкі як дрэва, звязанага са светам памерлых, невыпадковае.

Падрыхтоўкай сцэнарыяў фальклорных свят з энтузіязмам і вялікім задавальненнем займаюцца як студэнты-філолагі, так і прадстаўнікі іншых факультэтаў, якія заўсёды запрашаюцца да ўдзелу ў творчых імправізаваных сцэнах. Апошнім часам у кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі даволі плённае супрацоўніцтва наладзілася з прадстаўнікамі біялагічнага і гістарычнага факультэтаў. Сумесная творчасць дала магчымасць студэнтам Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта прадставіць беларускае вяселле падчас правядзення “Бібліяночы” ў абласной бібліятэцы Гомеля, падзяліцца ведамі пра традыцыйныя беларускія каляды ў перадачы “Добры вечар, Гомель”.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пасля адбору фактычнага матэрыялу, напісання сцэнарыя, студэнты размяркоўваюць ролі і пачынаюць падрыхтоўку тэатралізаванай складаючай. Для студэнцкай моладзі гэта даволі важная частка падрыхтоўкі свята, таму што дае магчымасць выяўляць лідараў сярод маладых людзей, вучыць размеркаванню функцый у калектыве (няхай сабе і ў часовым творчым), дазваляе фарміраваць адказнасць кожнага за агульную справу і за якасць інфармацыі, якая прапануецца гледачу, за яе творчую інтэрпрэтацыю.

Увогуле ўдзелу ў творчым працэсе ўзнаўлення на сцэне колішніх абрадаў і іх свядомае імкненне захаваць пры гэтым іх мясцовую аснову, несумненна, дапамагае глыбей спасцігнуць першасную крынічную прыгажосць мясцовага фальклору, забяспечыць пераемнасць самабытнай культуры, гарманізаваць адносіны паміж пакаленнямі. Студэнты, працуючы над складаннем сцэнарыяў народных святкаванняў, усведамляюць, як важна надзвычай сур’ёзна і адказна адносіцца да фіксацыі тэкстаў і мелодый песень, скрупулёзна запісваць звесткі па абрадах і звычаях, ашчадна захоўваючы пры гэтым асаблівасці мясцовай гаворкі. Безумоўна, што такая форма далучэння студэнтаў да народнай традыцыйнай культуры надзвычай важная для фарміравання павагі да гістарычнага мінулага нашага народа, выхавання цікавасці да традыцый роднага краю.

На працягу многіх гадоў студэнтамі розных пакаленняў былі падрыхтаваны на аўтэнтычным матэрыяле і прапанаваны для прагляду розныя сцэнарыі народных свят і абрадаў: “Беларускі кірмаш”, “Гуканне вясны”, “Купалле”, “Каляды”, “Масленіца”, “Вячоркі”, “Народная гумарына”, “Вяселле”, “Хрэсьбіны” і інш.

Не выклікае пярэчаннеў факт, што сцэнізацыя абрадаў менавіта на глебе мясцовага фальклору дапамагае глыбей спасцігнуць духоўную культуру беларусаў, а сцэнічны паказ фальклорных святаў – своеасаблівы экзамен на веданне традыцыйнай культуры сваёй маленькай радзімы.

Адукацыйны працэс, як вядома, – гэта стварэнне ўмоў для інтэлектуальнага і духоўнага развіцця студэнтаў, для станаўлення іх як сапраўдных прафесіяналаў, здольных рэалізавацца ў розных відах дзейнасці, запатрабаваных высокім узроўнем развіцця сучаснага грамадства. Менавіта таму арганізацыя фальклорных свят з’яўляецца важным кампанентам вучэбна-выхаваўчай дзейнасці выкладчыкаў кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі УА “ГДУ імя Ф. Скарыны”

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ